# СТАРЫЯ ПАШТОЎКІ ВЯРТАЮЦЬ ДА ПАДЗЕЙ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ

## Новыя выданні серыі «У пошуках страчанага»

**1 ліпеня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі а 16-й гадзіне адбудзецца прэзентацыя новых кніг вядомага ў краіне філакартыста Уладзіміра Ліхадзедава — «Блакада» і «75 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне».**

Праект «У пошуках страчанага», якім калекцыянер апякуецца ўжо болей за пятнаццаць гадоў, цяпер уключае звыш 20 філакартычных альбомаў. Кнігі, якія будуць прэзентаваны на пляцоўцы Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, прысвечаны тэме Вялікай Айчыннай вайны. Рэпрадукцыі старых паштовак расказваюць пра тыя ці іншыя мясціны Ленінграда — сённяшняга Санкт-Пецярбурга, пра блізкія ваколіцы горада на Няве. Пра тое, якімі былі розныя адрасы ў пярэдадзень вайны, а пасля і ў гады ліхалецця. Многія ілюстрацыі прысвечаны перапісцы, ліставанню жыхароў блакаднага горада, іх родзічаў. Чытаеш словы, выпісаныя сэрцамі людзей, — і адкрываеш для сябе новае аблічча гераічнай і драматычнай памяці.

Выданне «75 гадоў Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне» — яшчэ і збор рэпрадукцый старых плакатаў, што настройвалі людзей на перамогу, пераадольванне страху, стварэнне жывога, светлага настроя.

Прэзентацыя філакартычных выданняў — толькі адзін з элементаў выстаўкі «Вайна і мір. Беларусь памятае. Вяртанне», праекта, заснавальнікам якога поруч з НББ з'яўляецца Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Сімвалічна, што адкрыццё выстаўкі адбываецца напярэдадні Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь. Усім гасцям прэзентацыі кніг, выстаўкі старых паштовак з калекцыі У. Ліхадзедава будуць уручаны рэпрынты паштовак. А таксама — копіі старых дарэвалюцыйных газет.

**Алесь ПЯСЧАНСКІ.**